**ПАЛАТАЛІЗАЦЫЯ**, дадатковая да асноўнай артыкуляцыя зычных, якая выражаецца ў пад'ёме сярэдняй часткі языка да цвёрдага паднябення і суправаджае губную, пярэднеязычную або заднеязычную артыкуляцыю зычнага. У беларускай мове палаталізаванымі могуць быць усе зычныя, за выключэннем «ж», «ш», «дж», «ч», «р», «ў». Гукі, для якіх П. – асноўная артыкуляцыя, з'яўляюцца палатальнымі (бел. «j»). Гістарычна адрозніваюць тры тыпы П.: першая (да 6 ст.) – змяненне заднеязычных «г», «к», «х» перад галоснымі пярэдняга рада ў «ж», «ч», «ш» («но**г**а – но**ж**ька», «кри**к**ъ – кри**ч**иши», «стра**х**ъ – стра**ш**ьнь»); другая П. (6 – 7 ст.) – змяненне «г», «к», «х» перад «h» і «и» ў «з», «ц», «с» («помо**г**у – помо**з**и», «ру**к**а – ру**ц**h», «воро**г**ъ – ворози»); трэцяя П. (7 – 9 ст.) – змяненне «г», «к», «х» пасля галосных пярэдняга рада ў «з», «ц», «с» («кън#**г**ыни – кън#**з**ь», «ли**к**ъ – ли**ц**h», «вь**х**ъ – ве**с**ь»).

*Д.В.Дзятко*

*Выкарыстоўваецца шрыфт "Іжыца". Выгляд артыкула наступны:*

**ПАЛАТАЛІЗАЦЫЯ**, дадатковая да асноўнай артыкуляцыя зычных, якая выражаецца ў пад'ёме сярэдняй часткі языка да цвёрдага паднябення і суправаджае губную, пярэднеязычную або заднеязычную артыкуляцыю зычнага. У беларускай мове палаталізаванымі могуць быць усе зычныя, за выключэннем «ж», «ш», «дж», «ч», «р», «ў». Гукі, для якіх П. – асноўная артыкуляцыя, з'яўляюцца палатальнымі (бел. «j»). Гістарычна адрозніваюць тры тыпы П.: першая (да 6 ст.) – змяненне заднеязычных «г», «к», «х» перад галоснымі пярэдняга рада ў «ж», «ч», «ш» («**нога – ножька**», «**крикъ – кричиши**», «**страхъ – страшьнь**»); другая П. (6 – 7 ст.) – змяненне «г», «к», «х» перад «ѣ» і «и» ў «з», «ц», «с» («**помогѹ – помози**», «**рѹка – рѹцѣ**», «**ворогъ – ворози**»); трэцяя П. (7 – 9 ст.) – змяненне «г», «к», «х» пасля галосных пярэдняга рада ў «з», «ц», «с» («**кънѧгыни – кънѧзь**», «**ликъ – лицѣ**», «**вьхъ – весь**»).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ